# МАРУ БЫЦЬ ЛІЦЭІСТАМ!

***Менавіта гэту фразу можна было пачуць у суботу 21 студзеня на самым першым для Ліцэя ВДУ Дні адчыненых дзвярэй. Больш за 100 будучых навучэнцаў разам з бацькамі завіталі ў нашу альма-матэр, каб атрымаць адказы на хвалюючыя іх пытанні.***



Пачалося мерапрыемства з сустрэчы ў актавай зале з дырэктарам Ліцэя ВДУ Наталляй Шчагловай. Яна расказала аб уступнай кампаніі 2023 года, а таксама аб цікавым і насычаным жыцці ліцэістаў. Дарэчы, у гэтым годзе ёсць змены, якія датычацца паступлення ва ўстановы вышэйшай адукацыі пасля заканчэння ліцэяў. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 3 студзеня падпісаў Указ №2, якім зацвярджаецца новая рэдакцыя Правілаў прыёму асоб для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі. У прыватнасці, без уступных выпрабаванняў праходзіць залічэнне пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд; пераможцаў універсітэцкіх алімпіяд пры паступленні ў гэтыя ўстановы вышэйшай адукацыі; выпускнікоў Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка па рэкамендацыі наз іральнага савета; выпускнікоў ліцэяў пры ўніверсітэтах пры паступленні ў дадзеныя універсітэты; асоб, якія здалі Адзіны дзяржаўны экзамен у Расійскай Федэрацыі (пры паступленні на платную форму навучання).

Павітаць будучых ліцэістаў прыйшлі прарэктар ВДУ Ірына Сёмкіна, дэканы профільных факультэтаў, выкладыкі. Ліцэісты ж падрыхтавалі шмат сюрпрызаў. Гэта і вясёлыя пастаноўкі, і танцавальныя нумары,і песні пад гітару...

Пасля канцэрта будучыя ліцэісты разам са сваімі бацькамі наведалі кансультацыі па прадметах уступных выпрабаванняў.

«Несумненна, Дзень адчыненых дзвярэй – важны дзень для Ліцэя ВДУ. Гэта магчымасць паказаць жыццё навучэнцаў: вучобу, мерапрыемствы, іх інтарэсы ў вольны час.

Ліцэй ВДУ – самая маладая навучальная ўстанова сярод ліцэяў Рэспублікі Беларусь. Мне як дырэктару вельмі прыемна, што на Дзень адчыненых дзярэй завітала вялікая колькасць будучых навучэнцаў разам з бацькамі», – адзначыла Наталля Уладзіміраўна.

Я запыталася ў хлопцаў і дзяўчат, на які профіль яны збіраюцца паступаць і чаму.

**Ганна ГІРОНАК, навучэнка сярэдняй школы №31 г. Віцебска імя В.З. Харужай:**

–Я планую паступаць на гуманітарны профіль. І гэта невыпадкова! Я вельмі люблю вывучаць гісторыю і мовы. Для мяне прыкладам з'яўляецца настаўнік рускай мовы і літаратуры Сяргей Віктаравіч Тугарынаў.

Мару стаць навучэнкай Ліцэя ВДУ. Я упэўнена, што тут бурліць актыўнае жыццё. Падчас вучобы я абавязкова стану ўдзельніцай каманды КВЗ і танцавальнага калектыву.

**Анастасія МІРОНАВА, навучэнка сярэдняй школы №6 г. Віцебска імя А.Я. Белахвосцікава:**

–Я выбіраю хіміка-біялагічны профіль. Лічу, што хімія і біялогія – два самых цікавых прадмета. Іх немагчыма зазубрыць, а трэба вучыць з першых урокаў і спрабаваць зразумець матэрыял.

Мая настаўніца па біялогіі – Алена Васільеўна Ягодзік. Яна вельмі даступна падае самую цяжкую для разумення інфармацыю і заўсёды дапамагае разабрацца ва ўсіх пытаннях.

Жыццё пакажа, якую прафесію я абяру ў будучым. Можа, гэта будзе медыцынская ці педагагічная сфера.

**Іван ТАНКАВІД, навучэнец Альгоўскай яслі-сад-базавай школы Віцебскага раёна:**

–Мая мара – паступіць на фізіка-матэматычны профіль Ліцэя ВДУ. Мяне прыцягваюць дакладныя навукі. Я ўпэўнены, што ў фізіцы і матэматыцы ёсць шмат нязведанных задач, і мне хочацца іх рашыць.

У ВДУ я не ў першы раз. З 5 класа я наведваў курсы па праграміраванні і робататэхніцы на факультэце матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій. Зараз жа на выхадных я прыходжу займацца матэматыкай да Наталлі Уладзіміраўны Шчагловай. Сваё жыццё хачу звязаць з IT-сферай.

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**
**Здымкі аўтара.**

Фота- і відэарэпартаж глядзіце з дапамогай QR-кода.



